Ба 49960

Ба 49960

АЛЬБЭРТ ПАЎЛОВІЧ

# СНАПОК

(ЗБОРНІК ВЕРШАЎ)

Ба 49960
Бел. аддзел
1994 г.
LATVIJAS VALSTS BIBLIOTEKA

ВЫДАВЕЦТВА Ў. ЗНАМЯРОЎСКАГА. ДРУКАРНЯ „ДРУК"
СУБАЧ 2. ВІЛЬНЯ, 1921 г.

Дзяржаўная бібліятэка БССР імя В. І. Леніна
Ба 3455

Sk. S.L.m.
№ 62490
11.XI.38.

23. U 4. 2009

## „Працуй і пей“

Што сядзіш ты, мой браце, панурэны
І аб чым так смуцішся душой?
У тваей хатачцэ цеснай, закурэнай
Вее смуткам і цяжкай нудой.
І чаму твая грудзь увалілася,
Гдзе твой голас, гдзе песьня твая?
Глянь! жыцьцё новым ключэм забілося,
Пасьля полагу ўстала земля:
І алвха і верба распускаюцца,
С-пад зямлі выглядае пасеў,
Чуеш: птушкі пяюць, заліваюцца;
Вунь на купіне бусел прысеў,—
Жджэ, ці скора кабылка касматая
С табой выйдзе зрэзаць баразну,
І знаёмая песьня аратая
Ад душы прывітае вясну.
Ты маўчыш, а з вачэй сьлёза мутная
Пакацілася ціха далоў—
Надаела, знаць, жыцьце безпутнае
І чужых пільнавацца кутоў...
Ты гаруеш, што праца крывавая
Век кладзецца на полі чужым,
У мазалях твае рукі каравые
Адпачынку ня знаюць зусім.
Пей! паслухай мяне, брат, гаротнаго:
Чым больш жалю, сьпевай тым мацней!
Песьняй ўцешыш ты бусла маркотнаго,
І самому шмат стане лягчэй!

## Трывога

(Пасьвяшчэньне Д. Х. Ратгаузу).

Надойдзе мінута, і хваля марская
Узарвецца высокай сьценой,
І вые, і плачэ, як пушча лесная,—
Замрэ—зноў і ціш, і спакой.
Кругом анямее прастор серад ночы—
Ні шуму, ні ветру нігдзе...
Ля берэгу пена ледзь чутна шапочэ
І, таючы, нікне ў вадзе.
У лёгкай дрэмоце застыгне прырода,
Укутаўшысь сьвежаю мглой.—
Шчасьлівая хвіля! прастор і свабода
Клянуцца быць вечна са мной.
І мілая хвіля так цешыць мне душу,—
Аж верыць ня хочэцца мне,
Што новы прыбой дзікім стонам заглушэ,
Што скора ён, скора памкне;
Што ў гэтай спакойнай і ціхай пагодзе
Скрываецца здрада, мана;
Што хвалі час доўгі ня могуць у згодзе
Ужыцца з сабой, як адна...
І верыць ня хочу, што ўспеніцца морэ,
Завые, застогне яно,
Што хвілі спачынку ад смутку і гора
Прабыць доўгі час не вольно;
Што ўсё у прыродзе не вечно, не трвало—
З мінутай зменяецца ўсё,—
Адно толькі горэ, калі напаткало,
Дык думкамі струець жыцьцё.
Панурые, злые, гнятуць яны сэрцэ—
Мінута—зноў здрадны спакой...
І так у трывозе век цэлы да сьмерці
Змагайся з людзьмі і з сабой!!

* * *

(З. Д. Ратгауза).

Паглядзі, якая хмара,—
Колькі смутку, скаргі ў ёй;
Бытцам сьлёзы, дажджу каплі
Паліліся над зямлёй.

Момэнт—хмары той ні знаку,
Ветрам чыста развяло.
Так і мы, брат, век праплачэм,
Згінем,— нас як не было!

* * *

Афярую
Якубу Коласу

У хаце сьветлай і прасторнай
Холадна без конца;
Праз вакно, хоць пaглядае,
Ды ня грэе сонцэ.
А на лаўках, скачанеўшы,
Ціха сідзяць дзеці:
Іх цікавіць, што вучыцель
Кажэ ім аб сьвеці
Гдзе цяпло, зьвяры і птушкі,
Караблі ды морэ,
Скуль багацтва і дастаткі,
Бедната і горэ.
С чыстым сэрцэм налегае,
Каб навукі семя
Бедным сельскім хлапчэнятам
Усадзіць у цемя.
Мерзнуць дзеці і вучыцель
У халоднай хаце;
Іх душа адным сагрэта:
„Навука — багацьце!"

## Старэц

Чуць дзень той настане, ад самаго раньня
Чуць блісьне сьвет сонца ў вакно,—
Дзядочэк старэнькі, як сьвітка, сівенькі
У дождж і ў пагоду адно:
Лахмоцьця, што мае, атопкі ўздзевае,
Дзьве торбы за плечы кладзе,
Падвяжэ вяроўку і так на жаброўку
Падпёршыся кіем ідзе.

Чуць ногі валочэ, у нос штось бармбчэ
(У дарозе заўсёды шэптаў);
Ці пацеры можэ, ці, крый таго Божэ.
Свой век і жыцьцё скаё кляў.
Як ўспомніць былое сваіх, сваіх дзетак трое
І як пазьміралі яны:
Перш-на-перш-то матка, за ёй і дзіцятка;
Як смутна гудзелі званы;
І як ўсё багацьце, што было ў хаце
Пажар ненасытны паеў.
Сам зсунуўся з болю, ўвяз у нядолю,
Астаўся адзін, асівеў
Цяпер пры дарозе, пры крыжу й бярозе
Ен мейсца сабе абабраў.
Да самага змрока, прыжмурыўшы вока
С кантычкі ныдліва сьпеваў.
Хоць мокра, хоць суха, хоць часам за вуха
Без жаласьці хваце мароз,
У спек і завеі сядзіць без падзеі,
Ці кіне яму хто хоць грош.
І гэтак другая ўжо восень мінае—
Пад крыжам вякуе наш дзед:
І хворы ня еўшы, сядзіць скачанеўшы
Без стравы: хлеб—цэлы абед!
Пяе чуць праз зубы, калоцяцца губы,
Увесь ён трасецца і сам,
Стаіць на каленях і ў гэткіх цярпеньнях
Чакае канца сваім дням.
Ды цяжка ўздыхае, калі ўспамінае
Былое, што ў вечнасьць зышло.
Нераз ля бярозы цяклі яго сьлёзы
І сэрцэ крывёю зліло.
Яго не пытайце і жаль не ўздымайце
Ен вам не здалее сказаць,
Як ў жыцьці раз першы крыж той падцерпы,
Сеў з торбай пачаў жабраваць,
Сперш ён ня сьмела, хоць сэрца балела,
Прыгнуўся і сеў на зямлі,
Здалеўшы ўсе мукі, выцягіваў рукі
Да тых, што мінаючы йшлі.
Ня дзіво, мой браце, па гэткай страце
Што з гора калі і запьеш,
Тады на гадзіну забудзеш судзьбіну
І здасца табе, што жывеш.

## Пястун

Ля стала стаяла маці,
Песьціла дзіцятка.
Сын разроўся без прычыны, —
Рады ня дасьць матка.
І так, і сяк яго песьціць,
Узгадвае, што трэба:
— „Можэ сыру, млечка, масля?
Мо да грыбкоў хлеба?
Годзі плакаць, мой сыночку!
Успакойся крышку!“
Саўка злуе — бразь аб землю
І грыбкі, і лыжку!
— „Ну, чаго-ж ты? што с табою?
Што-ж так узлаваўся?
Можэ хвор ты? — маці кажэ;
Бач, як смардаваўся!“
Саўка стаў цішэць патроху,
Цэдзіць ён праз губы:
„Грыб няжованы пабег зноў.
Неўлавіў на зубы!“

## І плач не паможэ

Сын радзіўся на сьвет Божы,
Як дзьве кроплі з бацькам схожы,—
Гэта так здаецца.
Праз два тыдні кумы сталі,
Сынку „Зміцер“ імя далі, —
Гэта так вядзецца.
Сын расьце, ўжо знае сьмехі,
Ждуць с сынка бацькі пацехі —
Гэта так здаецца.
Песьцяць нацта, смокчуць губы,
Зміцер лоўка бье у зубы, —
Гэта так вядзецца
Матка зноў неўсцерэгае —
Ен маленькі, дык ня знае! —
Гэта так здаецца.
У Змітра без перастрогі
Параслі ўжо добра рогі, —
Гэта так вядзецца.

Што угледзіць, давай скора,
А то набярэшся гора,—
Гэта так здаецца.
А дадуць, таўчэ і псуе,
Паліць, смаліць, рве, муштруе,—
Гэта так вядзецца.
Дзярэ кніжкі, дзе злучыцца,
Бацькі рады: будзе ўчыцца,—
Гэта так здаецца.
Кніжак многа накуплялі,
Сына ў школу адаслалі,—
Гэта так вядзецца.
Год, другі—сынок у школі,
Час не траціць на сваволі,—
Гэта так здаецца.
А ён, абы вышаў з хаты,
Ловіць рыбу, бье курчаты,—
Гэта так вядзецца.
Зміцер, глянь, ужо дзяціна—
Сам—як мех, як сані сьпіна,—
Гэта так здаецца.
Не вучыўся, не стараўся,
З лайдакамі піў, спазнаўся,—
Гэта так вядзецца.
Маці кажэ: „ў войску будзе,
Там з яго мо выйдуць людзі“,—
Гэта так здаецца.
Ужо гвардзейцам сын харошы,
Пішэ к бацьку прыслаць грошы—
Гэта так вядзецца.
Бацька шле—як скончыць службу,
Пасталее, звядзе дружбу.—
Гэта так здаецца.
Сын тымчасам, як грош мае,
У рэстаранах пье, гуляе,—
Гэта так вядзецца.
Ну, нехай! як верне ў хату,
завядзём яго мы к свату,—
Гэта так здаецца.
Ажаніць мо як удасца?
Аж куды там! Ліха трасца!—
Гэта так вядзецца.
У вёсцы будзе яму міла.
Аж ня так ня тут то было!—
Гэта так здаецца.

Зьмітр прыехаў. Хмурыць вочы,
У вёсцы ўсіх і знаць ня хочэ, —
Гэта так вядзецца.
Не раўня яму ўсе сталі —
Сьвіт, сермяг не паскідалі, —
Гэта так здаецца.
У Зьмітра ўжо шмат зухвальства,
Ен і стражнік, і начальства, —
Гэта так вядзецца.
Бацька рад, і вёска рада:
Есьць зашчыта, помач, рада, —
Гэта так здаецца.
Ды дарма уся спадзея
Ад такога дабрадзея, —
Гэта так вядзецца.
Гдзе нешчасьце, ці крадзежа,
Яго дзело трапіць сьвежа. —
Гэта так здаецца.
Але Зьміцер ані дбае,
Як запьецца, дык гуляе, —
Гэта так вядзецца.
У шынку абіў парогі,
Маці цягне стуль за ногі, —
Часта так здаецца.

## Сыноуская апека.

Пастарэў, зсівеў наш бацька, як смарчок зрабіўся
За свой век клаў працы многа ды ўжо с сілы збіўся.
Падзяліў зямлю і хату між двума сынамі,
Пажаніў іх, даў ім спосаб—нехай жывуць самі.
Сыны рады і нявесткі—прыспарыло многа;
Далі слово не пакрыўдзіць, дагледаць старога.
Прайшоў год, другі і трэцьці, памяць карацее...
Абяцанка з думак выйшла бацька больш грыбее.
Ужо с печы і ня злазіць, аслабеў, паў духам;
Дый нявесткі пабляжэлі, не вядуць і вухам.
Сыны пойдуць на работу, ў полі палуднуюць —
Стары нашчо да вячэры церпіць і гаруе.
Але раз ужо няўцерпеў, згаладаўшы дужэ,
У сыноў сваіх пытае: «Як суменьне рушыць?
Ці нявесткі, ці вы самы, вінен хто—ня знаю,
Чаму-ж гэта да вячэры нашчэ я бываю?



Дзяржаўная бібліятэка імя В. І. Леніна БССР

Я-ж меў жонку — вашу матку, працаваў, стараўся,
Дагледаў, пясьціў, на старасьць ўцехі спадзеваўся...
Вы-ж не цяжкі тады былі ані мне, ні матцэ,
Была ежа і адзежа, і куток у хатцэ".
Аж на тое сын лагодны атказ барабаніць:
„Пакінь, стары, блазнаваці, жонак нашых ганіць.
Мы-ж былі у вас малые, як шпачкі Тамаша:
Жменька бобу, лыжка кашы — во еда ўся наша.
Ты-ж, стары, з вялікай глоткай, а сам больш мядзьведзя.
Чорт і ўкорміць, калі хлеба больш куліды едзе".
Бацька змоўк. Атказ нягодны цяпнуў, як абухам.
Словы подлые зьвінелі доўгі час над вухам.

## Гаспадыніна дзежа

Два краўцы, Іван з Ігнатам, цэлы век свой двое,
Вандравалі па мястэчках з аднаго ў другое.
Дзе здарэньне ім работу распытаць памажэ,
Там і шылі — жонцэ сукні, кажухі для мужа.
Неразлучны, разам двое, як два родных браты,
Цэлы век свой аджывалі па вясковых хатах.
Жылі ў Гапы і ў Гарпіны, Марыі Аўдоцьні,
І ў Праксэды, і у Ганулі. Але ўжо наўпроці
Юлькі з Лошы гаспадыні, кажуць, знайсьці трудна.
Пыл і сьмецьце, павуціна і без конца брудна.
Праўда, трудна каб было ўсё з раніцы прыбрана:
То неўпраўка, а то дзеці ўскруцяцца зарана.
Але ўсё-ж відаць пажыўшы разам час някі,
Хто чым пахне, чаго варты і якіе знакі.
Краўцы бачаць адны бруды ў будні і у сьвята,
Што у іншай хлеў чысьцейшы, як у Юлькі хата.
Што начыньне — лыжкі, міскі ў палец абкарэлі;
Як зямля і стол — і лаўка, гэтак учарнелі;
Страшна глянуць на бялізну, а ня то што стыдна;
Дзежка цестам так заросшы, што і дна ня відна.
Ледзь кулак адзін пралезе. Давай наругацца —
Між сабою, нібы праўды, пачалі спрэчацца.
„Не пляці, Ігнат, пустое. Дзіўныя навіны!
Дзе ты бачыў дзежку с цеста? Ешчэ скажэш з гліны!
Гэтак хто чужы пачуе, сьмеху не стрымае!"
Ян, каб чула гаспадыня, гэтак улучае.
А Ігнат сячэ пад тое: „Не спрэчайся, браце.

Хіба сам вазьмі прыглядзься, дзежка-ж во у хаце.
Каб дзежка была, як кажэш, з цеста, ня з гліны,
Дык было-б і дно, і клёпкі, і звон быў-бы інны".
Ян аж плюнуў, нібы з злосьці. Стаў казаць Ігнату,
Як раз з сенцаў гаспадыня зноў прыйшла у хату:
„Пан Ігнат! Пакінь ты спрэчку. Годзі блазнаваці!
Як аблупіш хоць чым з верху, зможэш распазнаці.
С цеста іх ніхто ня лепіць, гэта пэўне знаю".
„Ціха. Пойдзем аб заклад мы, я ўжо не прайграю".
Так сказаў Ігнат і выйшоў пашукаць сякеры.
Не пазнаўшы войстрых сьмешак, ціха цераз дзьверы
Гаспадыня Яну шэпчэ, праве аж на вуха:
„Майстрок, сьмела закладайся і мяне паслухай:
„Як прыйшла я ў гэту хату,—лгаць табе ня маю,—
„Абручы ешчэ знаць былі, гэта добра знаю".

## С кірмашу

(ЖАРТ)

Саўка Смык, прадаўшы збожэ, пасьпешаў да хаты;—
Ехаць шмат было дарогі, а час пазнаваты.
Толькі каня выцяў пугай, рынак абмінае,
Чуе: з-заду крычыць нехта і рукой ківае:
„Затрымайся, калі ласка. Паможы ў патрэбе.
За дабро сваё адплату будзеш мець у небе.
Падвязі мяне старога, зрабі ласку, пане,
Вельмі-ж трэба, каб да дому трапіць мне заране".
Збедаваўся, разстагнаўся, давёў Саўку к жалю.
Хоць каню за цяжка трохі, ня мог слухаць далей:—
„Добра, кажэ. Сядай, едзем--весялей ў дарозе!"
Згарнуў сена, мех падкінуў, прымасьціў у возе.
Едуць разам. Каб час сцерці, павялі размову.
Стаў тады купец хваліцца, што каня, карову
Прадаў сходна. Цяпер мусіць з грашыма ў кішэні
Сам ісьці пяць міль да дому, а ноч—як у жмені,
Ужо блізка падыходзіць, сонцэ дагарае.
Саўку ёкнуло у сэрцэ. Прыйшла мысь благая—
Дармаеда купца—хціўцу, што прывык к чужому,
Напужаць хоць раз ды добра, едучы да дому.
Едуць мілю і другую, трэйцю ўжо мінаюць.
Саўка жартам купца страшыць, плясьці пачынае:
„Скажы, пане, ці ты знаеш гэтую дарогу?
І ці чуў калі часамі, што шмат людзей Богу

Сваю душу тут аддалі пад нажом зладзеёў,
І што ў лесе, гдзе мы едзем, такіх дабрадзеёў
Есьць не мала". Той спужаўся, просіць, каб вярнуцца,
Ледзьві ўжо сядзіць на возе, лыткі аж трасуцца.
Саўка, нібы пацешае, купцу кажа ціха:
„Пане, надта не пужайся, дасьць Бог мінем ліха,
Я тутэйшых ўсіх зладзеёў абміну у ночы.
А калі затрымаюць, распытаць хто схочэ,
Скуль, куды і што с сабою я вязу да хаты,
Я патраплю стказаць ім. Толькі, пане, платы
Не шкадуй мне. Я надумаў, Гэтак будзе к ладу:
Пана ў мех свой усаджу я, сам прыткнуся к заду.
Скажу — шкло вязу ў Замошэ, калі хто спытае".
Купцу з страху дух заняло, галавой матае.
Толькі гэтак між сабою радзяцца, мяркуюць,
Аж з далёку хтось азваўся. Купец гэта чуе —
Просіць Саўку хутчэй з страху патрымаці торбу,
Ды барждзжэй улез, схаваўся, лёг у версе горбам.
Саука мех зьвязаў вузламі. Сам чуць сьмех стрымае,
Сьцяў зубамі моцна вусны, каня паганяе.
Добра штука удалася, — лепей і ня трэба:
Купец ў торбе, ноч глухая і як сажа неба...
„Стой,—крычыць, зьменіўшы голас—стой! Куды ты едзеш?
Затрымайся, а то сьвету зараз не угледзіш!"
Потым кажэ сваім тонам: „А мае-ж паночкі,
Пасагу вязу ў Замошэ, для каханай дочкі".
А сладзей ня хочэ слухаць, вельмі нецярплівы,
Крычыць злосна: „Давай грошы!" (Саўка тон звяглівы
Лоўка зной зьмяніў і гэтак, што пазнаць аж трудна)
Купец з страху сабе мысьліць—„пэўне будзе трудна".
Але чуе, што вазака лгаць ім не праміне:
Кажэ, грошы ён ня мая апроч шкла — начыньня.
Во, у торбе; дый стаў з імі сьмела агрызацца.
«Добра кажа злодзей, ўбачым, будзем дазнавацца».
І пад тое Саўка пугай купца выцяў жыва
Так, што пэўне не ўцалела на тым мейсцу гніда,
Але страх змагае болі—той цярпець стараўся,
Крыкнуў „дзынь... нь.. .нь..." і шклом пабітым нібы адазваўся.
Саўка пугай зноў па торбе шмаргануў з разгону.
Купець піснуў: „дзынь... нь.,. нь..." праз слёзы і дрыжыць
Сьцябануў ешчэ раз трэйці Саўка праз сваволю, (адгону.
„Дзынь... нь,.. нь..." так сама купец крыкнуў, не ўстрымаўшы
Годзе здзеку! Саўка нібы стаў ужо ў зашчыту; (болю.
„Што ж ты, гад, прыстаў так пільна—ўсё начыньне збіта!

Калі злезу зараз з возу дый калом ўгрэю —
Будзе грошэй тут у волю для цябе, зладзею».
Сам затупаў па дарозе, нібы дагаляе,
Рад купец, что верх вазакі, лёгка уздыхае.
Лежаў ў торбе моўчкі, думаў: „што, каб не пагроза?"
З морг абегшы, Саўка злосны павярнуў да воза.
Нібы з лаянкай праўдзівай ў перэдку садзіцца,
Сячэ пугаю канягу і далей імчыцца.
А ўжо ранніца, сьвятлее. Едуць з вярсту ціха.
Вазак кажэ: „Лезь пан з меху, ўжо мінулі ліха.
Я сяк-так абараніўся, нехай чорт іх ладзіць;
Тая вёска недалёка, гдзе пан мусіш злазіць".
— „Ну, мой мілы, ўмееш трапіць", — купец рады кажэ,
„З лайдакамі так спрэчацца рэдка хто адважэ.
„Будзь так ласкаў, зайдзі ў хагу", купец Саўку клічэ.
Сэм шэпочэ штосьці з жонкай, ў руцэ грошы лічэ.
„Хоць чым кольвек, ну, хоць чаркай, я цябе частую,
„А за ўсё перш-на-перш дзякуй і рубель плачу я!"
Саўка выпіў, выцер губы, с павагай ад'ехаў.
Пасьля доўгі час, як ўспомкіць, паміраў ад сьмеху..

## Пан і акуляры.

Пад вечэр к пану на расплату
Мужыкі зыйшліся ў хату.
Стаяць, гамоняць ля парога;
Тут часам пан таго, другога
Ад грамады к сабе пакличэ,
Зірне у кніжку, грошы зліча,
Адласьць бяз крыўды, чыста, гладка;
Але прыйшла такі загадка.
Як раз Грыгору, як на тое,
Замест трох дзён злічыў пан двое,
Бо не ўчытаўся, глянуў скоса,
Праз што спрэчацца давялося.
Грыгор па своему рахуе —
Рублём ўсё болей, а пан злуе,
Ажно меняцца стаў у твары.
Нарэшці, ўздзеўшы акуляры,
Пан стаў у кніжку прыглядацца
І змоўк і годзі ўжо спрэчацца:
Падаць казаў сабе і Грышку
На міравую па кілішку.

Во сербануўшы трохі гары,
Грыгор хваліць стаў акуляры.
Нарэшце гэтак адмачыў
(Хмель, бытцам, розум замуціў):
„Во, дай-жэ, Божэ, мой паночку,
Здароўя гэтым шкляным вочкам:
Лепш панскіх сьвецяць, каб не зглазіць,
А тые хай хоць павылазяць!“

## Ракі.

Пан ды пану слаў гасьцінец — поўну торбу ракаў.
Даў пры гэтым ліст і кажэ: „Не пазьніся-ж, Якоў!“
— „Добра, пане!“ Во, назаўтра, толькі дзень зачало,
Якоў торбу ўспёр на плечы, барджэй, як папала.
Ліст укінуў за кашулю, глынуў квасу з жбана
папёрся з тым гасьцінцэм пасланцом да пана.
Дзень пагодны, сонца споўдня і пячэ і смаліць;
Якоў з ракамі па шляху без аддышкі смаліць;
Дзёр, як мог, аж зьліўся потам, змок, зьнібыткаваўся,
Мінуў поле, ў бор зялёны ледзьве ўжо дабраўся;
Ледзьве торбу здалеў скінуць, так прыстаў з дарогі;
Усё чыста адабрало: плечы, крыж і ногі.
Сьверб па скуры ўпацеўшай бегае, як блохі,
Згаладаў ён, дух чуць зводзіць. Рад спачыць хоць трохі,
Лёг пад ёлкай, расьцягнуўся і салодка дрэме—
Сонцэ з верху, як агнішчэ, прыпекае ў цемя.
Якоў сьпіць, раськінуў ногі, ляжыць, як завала,
Язык выткнуў церав зубы, як вужака джала.
Сьпіць, сапе, храпе, мармочэ, стогне, як авечка.
А тым часам ракі неяк вылезьлі з мяшэчка.
Праз гадзіну іх не стала: ўсе ў чыстым боры.
Распаўзьліся па мураўцы—хто, куды, каторы.
Ужо сонцэ нізець стало, як прачнуўся Якоў.
Хваць за торбу!.. аж пустая—чуць ён не заплакаў.
Кляў іх кляў—нема карысьці, што пачаць—не знае:
Ні лавіць іх, ні ліст несьці,—стаіць, паглядае.
Думаў, думаў і наважыў пану ліст адносіць—
Адпрашуся, трохі змоўчу, калі загалосіць.
Гэтак мысьліць. Праз гадзіну быў ужо ў пана;
Даў у рукі ліст, з самога льецца пот, як с крана.
У дрыжаку, жар кідае; моцна зябіць стало—
Гэтак Якова неўдача раптам разабрала,

Адыйшоўся. Ля парога жджэ, мо пан што схочэ.
А тым часам здалёк войстра пазірае ў вочы.
Што тут будзе? А ўжо з страху дзівы надаліся:
Бачыць, бытцам усе ракі на цяньк зыйшліся;
Як бы чуе іхні лопат... дык дарма трывога—
Пан і ліста перэгледзеў, не спытаў нічога,
Бо быў пэўны, што гасьцінец перэняты паняй.
А наш Якоў дык баяўся сам прызнацца раней.
А цяпер саўсім патрэбы не было казаць,
Калі пан і сам пра ракоў не пытае ў хаце.
Так і стало. Кожны думаў, кожнаму здалося...
Досыць, толькі пан ткнуў грыўню і пры гэтым просіць:
„Ты-ж падзякуў свайму пану ад мяне сэрдэчне
За гасьцінец і за памяць. Не забудзь, канечне!
Праз іх ласку, скажы пану, заўтра зьем прысмакоў".
Як быў смутны, дык так раптам звесялеў наш Якоў:
„Панок мілы! Ці-ж то ракі ўжо прыйшлі да пана?
Дзякуй Вогу! Яны ў лесе распаўзліся з рана.
Я ўжо думаў: яны зблудзяць, каб іх безгалоўе.
Аж, бач, не. Дык, мой, паночэк, ешце на здароўе!"

## Каты

(с праўдзіваго жыцьця).

Вельмі ў вёсцы нудна ў зімку, неяк пуста, глуха,
Скрозь сувеі, гурбы сьнегу, сівер, завіруха!
Ні душы жывой, ні слова: поле, сьнег і неба,—
Рэдка нос хто выткне с хаты і то ўжо с патрэбы.
У будні горш ешчэ, і вёска выглядае дзікай.
Во, ня дзіва, што часамі ксёндз з нуды вялікай,
Калі збрыдае таўчыся, як па пекле Марку,
С поўтрэцьці вёрст пехатою чэшэ да хвальварку.
С паняй мову у дваіх завядуць без конца—
І сьмяюцца, і бядуюць аб сваей староцэ;
Пры гарбаце час незначна нікне і сплывае.
Ксёндз пачне, а пані ўжо, як той млын, змлывае
У сьвежых мысьлях дзень сатрэцца, дзякуй Табе, Божэ!
Усё добра, але толькі знесьці ксёндз ня можэ,
Што старая пані надта ўжо катоў любіла
(Праўда ёй гадоў пад сотню—здзіцянеўшы была!).
Часта глядзіць іх і песьціць, садзіць на калені,
Як дзяцей усіх цалуе, клічэ па імені;
Да стала ўжо, як накрыюць, глядзі—ўсіх зывае:
Кацька, Машка, Рыска, Дашка,—чорт іх хіба знае!

Хто адкуль бягуць, мармочуць і за стол садзяцца
Навакола ля паненькі, як пры роднай матцэ
Ім усім асобна крэсла, мяска на талерцы.
За сталом тым і ксёндз разам, хоць не рад да сьмерці:
Трэба зносіць брыду гэту, хоць уцерпіць трудна,
Раз праз гжэчнасць, ды аднаму ешчэ горэй нудна.
Але ўжо не раз падумаў, як катоў тых зьвесьці,
Як чым кольвек іх настрашыць, каб к сталу палезьці
Не пасьмелі ані разу—нават ткнуць і носа
Треба-ж шчясьця—думкам збыцца скора давалося.
На абед ксёндз раз спяшыўся і прышоў зарана —
Глядзіць: пані нема ў дому, а к сталу прыбрана.
За сталом каты паселі, аж гараць іх вочы;
Той хвост ліже, а той дрэмле і праз сон мармочэ.
Ксёндз лёкая ціха просіць, каб дастаць дзе ёмкі
Ці бізун, ці пугавішч, ці рамень с пастронкі.
Трэба выцяць, задаць страху і так іх на пудзіць,
Каб ня ткнуўся з іх ніводзін, калі ксёндз тут будзе.
Лёкай рад (во будзе лазьня!—надаелі чэрці.
Прывалок бізун,—аддаўшы, прымкнуў крэпка дзьверцы,
У вакно стаў, паглядае—мо надыйдзе пані,
Каб даць знаць ксяндзу дакончыць муштры крыху раней...
Сонцэ сьвеціць у пакоі, каты дрэмлюць ціха
І ня сьніцца ім у во сьне, што пачнецца ліха.
Ксёндз, рукавы закасаўшы, выцер акуляры
Ды зненацку калі сьвісьне, калі дасьць прыпары,
Калі крыкне: „у Імя Ойца!..“ Тут каты ўжо нашы
Наўцекі; ксёндз жэгнае, бізун крыжам машэ;
Улучае, каб папасьці кожнаму у потку.
Баючысь ня скрыўдзіць часам ці ката ці котку.
Па парадку знаець лупіць. тольki сьвіст нясецца—
Тые ў страху, без прытулку, нема дзе падзецца:
Пруцца ў дзьвзеры, пад стол скачуць, аж пішчаць ад болю,
Скрозь па сьценах спрытна лазяць—вырвацца на волю
Нема рады тольki чуюць як іх ксёндз жэгнае,
Бізуном з вакон, са сьценак—адусюль сдыймае.
Злупцаваўшы усіх чыста, адчыніў ксёндз дзьверы;
Тые драла, на уцекі, як якіе зьверы.
Ен ешчэ іх у парозе переняў па разу.
Пэўны быў, што ад стала адвучыў заразу.
Пасьля муштроў да тэй пані ксёндз прышой ня скора.
Бачыць, зноў каты паселі; ён тады й гаворэ:
„Кепска пані прывучыла—катоў садзіць разам,
Гэта-ж кожны кот, вядома Божая абраза!

Гэта дух нячысты скрыты". Пані дай спрэчацца:
— „Іх люблю я гэтак моцна, ці-ж то можэ стацца?"
—„А во, пані, праканайся; злы дух унікае
Ад сяоў Божых і ад крыжа — пані-ж гэта знае!"
Устаў с крэсла (каты войстра пазіраюць скоса,
Баючыся, каб зноў часам не задаў ім чоса).
„Дык глядзіце-ж!" Падняў рукі: „ў Імя Ойца"' кажэ..
Каты драла — ў піск, у енькі, як-бы хто іх смажэ.
У дзьверы, ў вокны, пад стол скачуць, як ліха носе;
З дзіву паня аслупела — што-ткі ім сталося?
Веры даць сабе ня можэ, хоць глядзіць і чуе,
Стара плечы націскае, с перапуду плюе.
Ад тых дат катоў ні духу, нават ані сьледу,
Годзі ўжо з сабою разам іх садзіць к абеду.
Калі-ж лёкай не дагледзіць, — ведама, заняты,
Гоніць вон сама мятлою, валіць кіем с хаты.

## На хвэст

Ксёндз у простай каламажцы ехаў на хвэст з вёскі,
Калупаўся, дык спазьніўся; хмарнець стало трошкі.
Сонцэ стухло, і паляна пацямнела к ночы,
Клімка гоніць, конь нясецца засыпае вочы.
Цемнь ад хмары разлеглася, і туман бялее;
Шмат дарогі да гасьцінцу. Клімка не здалее
К ночы трапіць у мястэчка, дарма зацінае:
Конь змарыўся, бегчы далей ужо сіл ня мае.
— „Клімка!" — „Што?" — „Вярні, дзе ўбачыш ці карчму, ці хатку,
Заначуем, а назаўтра зноў пасыпем, братка".
—„Гутка блізка нема хаты, я дарогу знаю,
Скора ўедзем ў лес казённы, поле ўжо мінаю"
— „Дык пустое, зьвярні к лесу, і мы як цыгане,
Перабудзем пры дарозе, пакуль дзень настане;
Воз паставім за кустамі, нам ня трэба тока,
Толькі помні с каня ў ночы не спускай ты вока
Лес тут блізка ваўкоў многа а бяды крый Божэ"
— Добра ксенжу ўжо як-небудзь перабудзем можэ"
Ксёндз на возе спачывае, а вазак тымчасэм
З аглабель кабылку выпраг пусьціў самопасам
Ды пільнуе пагледае седзючы пры возе.
Гоніць думкі як то заўтра павядзе ў дарозе
Прысваніўся лёгка дрэме дый захроп паволі
А тымчасам воўк кабылу церабіў на полі.

Усхапіўся Клімка плачэ дазнаў бедны мукі!
Ксендза будзіць, сам галосіць і ламае рукі.
Ксёндз бядуе, каня шкода і на хвэст спазніцца,
Воз ні з мейсца, куфэр цяжкі — з ім-жэ не насіцца.
— „Ціха, змоўкні,—пробашч кажэ, — ўжо ня варнеш шкоды,
Лепей стань ды прыгледайся хоць якой падводы;
Мо пад'едуць, мы папросім, завязуць ў мястэчка,
Каламажку нашу, куфэр, а там — Бог уцечка!"
Сьпіць прырода, вецер сьвежы лёгка павевае,
Зоркі ў небе дагарэлі, трохі ўжо сьвітае,
Даль яснее чуць над лесам, цемнату сагнала...
Чуе Клімка: нехта едзе, конь ідзе памалу.
Пробашч выйшоў. Паглядаюць. Балагол далёка.
А у будзе жыд разлёгся і храпе глыбока. —
„Адпрагай каня", — ксёндз кажэ, — „адвядзі да воза,
Як ад'едзеш, пачэкаеш вунь ля той бярозы".
Клімка ўпрог каня, ад'ехаў, аттуль паглядае;
Ксёндз упрогся у ваглоблі і стаіць, чэкае.
Жыд прачнецца, махне пугай, крыкне „ну" — с прасоньня,
Ды ізноў храпе — ня бачыць штэ не стала коня,
І так раз, другі і трэйці сьцебане ён пугай,
„Ну", крычыць, а ксёндз ў ваглоблях звязаны папругай
Ані з мейсца, як урыты, ані зварухнецца,
Жыд схапіўся і ад страху ня знаў, куды дзецца.
Скочыў з воза ды к прабошчу, як трывалі грудзі,
Крычыць нема: „аддай конь мой, гвалт, ратуйце людзі!".
Ксёндз спакойне кажэ: „жыдзе, дарма ты ўзлаваўся,
Я быў конь твой, цярпеў кару, ды Бог злітаваўся,
Прайшоў срок маей пакуты за грэхі праз словы,
А сягоньня я свабодны; жыдзе, будзь здаровы".
Зняў хамут, дугу і лейцы, апусьціў аглоблі,
Падыйшоў да жыда й кажэ: „ведаеш, што зраблю:
Ахрысьціць цябе „агоем" зараз жэ я мушу,
С патампеньня вечнай кары тваю збавіць душу!"
Ды да жыда, ўзяўшы ў рукі крыж, ваду, крапідла.
Жыд наўцекі ў лесасекі паляцеў, як быдла.
І, адрокшысь балагола пабег шпарка ў вёску.
Тым часові пробашч с Клімкай націскаў патрошку.
Да гадзіны восмай зрана былі ўжо ў мястэчку.
Клім вярнуўся, а ксёндз на мшы сьпеваў „Бог уцечка!"
Час праходзіць, маўчыць Клімка, цешыцца с каняні,
Ды трымаць яго баіцца, бо пытае ўсякі,
Усе казэруць нейк вочы, скуль тое багацьце,
Клімка ў страху — аж ня можэ усядзець у хаце.

Не даюць яму праходу, так прысталі, гады!
На «Купалу» к ксяндзу едзе прасіць якой рады,
Так і гэтак яму кажэ—„ня маю спакою.
Усё баішся ды стыдзішся—ведама, чужое“.
— „Ціха, змоўкні, дамо рады, зрабі толькі гэта:
Заўтра на кірмаш каня адвядзі да сьвету,
Прывяжы яго да плоту, сам не патыкайся,
А здалёку неўзнак добра толькі прыслухайся:
Хто што скажэ, будзеш ведаць, можэ жыд той будзе,
Што узяд таму тры тыдні сонны ехаў ў будзе.
Калі ён каня пазнае,—не кажы нічога;
Я тады табе дам грошы, будзеш мець другога“.
А ксёндз гэты быў пацешнік, любіў жарты весьці,
Ужо грошы адлічыў, меў на почту несьці
Таму жыду адаслаці, крыўду каб загладзіць,
Альбо Клімку іх аддаць—у бядзе парадзіць.
Клімка ў ночы сну ня знойдзе, ходзіць, як забіты,
Галава як абручамі усё роўна збіта.
Ледзьве ранніцы дадзаўся, зрабіў па загаду:
Адыйшоўся, на гнядога пагледае з-заду.
Конь, як печка, крэпкі, жвавы і усіх цікавіць,
Блізка сотні яго цэняць дый яшэ больш прыбавяць.
Бедны Клімка ўжо бядуе, што пазнаюць скора,
А жыдоў кагал вялікі, кожны штось гаворэ,
Кожны нешта пагергечыць. радзіць штосьці, злуе,
А Клім тутка недалёка—усё чыста чуе.
Во адзін к каню падскочыў, аглядае скоса,
Шэрсць, капыта, усе знакі, і падобны з носа.
Хоць адразу пазнаў страту, але прыступіцца
Не адважыцца ніяк—нечэга баіцца,
Зубы сцяўшы, злосць ліхую хоць чым спаганяе,
Каня ў бокі і у морду куксай злосна ткае:
„Ты не конь, цябе я знаю, гэта „гой“ пракляты,
Каб ты выдах, не вазьму я, годзі несьці страты“.
Жыды зноў зыйшліся ў кучу, зноў загергеталі
І адзін другому ў вуха нешта пашэпталі.
Пасьля йдуць і ў морду плююць коніку гнядому,
І памалу іх не стало—пайшлі ўсе да дому.
Клімку толькі таго трэба, каб усе зракліся,
Праз гадзіну с канём сьмела дамоў валакліся.



Дзяржаўная бібліятэка БССР імя В. І. Леніна

*
* *

(з украінскаго).

Два майстры, знаць бацька з сынам,
Цэркву ўжо канчалі—
Засклянілі, пабялілі
І аўтар стаўлялі.
„Дзякуй Богу,—бацька кажэ,—
Страх змагліся людзі,
Дый ешчэ праверыць трэба—
Голасна як будзе“.
Бацька просіць: „Пастой сынку
Тут за абразамі,
Яж пайду і моцна сьвісну,
Стаўшы за дзьверамі“.
Выйшоў, сьвіснуў разоў колькі
І вярнуўся к сыну.
„Ну, што? спраўдзі чы галосна?“
Стаў пытаць хлапчыну.
„Ешчэ як,—той бацьку кажэ,—
Звонка бье у вышу“.
— „Ну дык ты ідзі і сьвісьні—
Сам праверыць мушу“.
—„Што ты, бацька, мне гаворыш? -
Сын без звагі хлішчэ,—
„Добра ведаеш, што ў цэркі
„Толькі дурэнь сьвішчэ!“

*
* *

Прыйшла ў цэркву раз бабуля, сьвечак накупіла
І дзе быў сьвяты абраз ўсюды іх ляпіла;
Пара сьвечэк застаецца—дзець куды ня мае:
„Ага!—трэба йшчэ Міціце“, стала і шукае.
Во Сьвятога ўжо Мікіту знайшла баба скора
(Той заняты: збароў чорта, нечымсь яго порэ).
Запаліла сьвечкі, ставіць адну ля Сьвятога,
А другую лепіць чорту не зважаўшы многа.
Бачуць людзі і ёй радзяць, каб там не ляпіла:
„Што ты,“—кажуць,—„робіш баба: тож нячыста сіла!“
Абярнуўшысь, так кажэ: „не судзіце, людзі,
З нас ніхто ня знае добра, гдзе па сьмерці будзе:
Чы у небе, чы у пекле скажуць векавапі,
Мець прыяцеля трэ ўсюды, каб нам мог спрыяці.“

* * *

Што пяць вёрст, то ўжо вядома: карчма зараз будзе,
Бо пяць вёрст кавалак добры—спачыць рады людзі.
Во, па шляху з рынку двое, воз за возам съедам,
Памаленьку ціха едуць гаспадар з суседам.
От так едуць сабе ціха, а рынку; грошы маюць.
Ляглі пузам на саломе, дрэмлюць, спачываюць!
Едуць, едуць дый паснулі у глыбокай думе.
Скора з іх адзін схапіўся, клічэ: „сьпіш ты, куме?"
—„Што гаворыш"?—сусед кажэ.—„Ці ты сьпіш—пытаю".
—„Дзе ты бачыў—дрэмлю толькі, думкі адганяю."
—„Абач, браце, дрэмаць годзе! глянь насупроць неба:
Як ты лічыш, колькі к небу вёрстаў ехаць трэба?"
—„А Бог яго сьвяты знае і добрые людзі;
Як здаецца, то ня болей, а с пяток дык будзе!"
„Што ты, куме, хіба баба табе набрэхала:
Каб было пяць вёрст, як лічыш, дык карчма-б стаяла!"

## Ружжо

Пётра Клюшня быў у Мінску неяк серадою:
Купіць меўся, калі трапіць, ружжо хоць якое.
А скупы быў—рублём болей заплаціць баяўся
І ўвесь дзень на Нізкім Рынку ўсюды прыгледаўся:
Можэ в рук дзе пападзецца, можэ знойдзе ў краме...
Ажно трапіў: жыд для стрэльбы купца жджэ пры браме.
Пётра стрэльбу ўзяў у рукі, агледае ўсюды:
„А што просіш за ламаку?" паспытаў у юды.
Тое, гэта старгавалі, цэна сходна—стое.
Толькі Пётра ў дуло глянуў—аж яно крывое.
„Не, ня хочу,"—Пётра кажэ, „бо дуло сагнуто,
Бачыш, во нарэз для кулі заедае крута".
—„Хіба, дурэнь, ты ня знаеш,"—кажэ балабоста,
„За то бье на ўсякі штукі: з за вугла і проста!"

## Хітры цыган

Цыган чуў, што ў мужыка многа кублаў сала,
Дык надумаў у яго пажывіцца мала.
Выбраў вечэр, сонцэ ўжо скрылося у лесе.
Цыган скокнуў у гарод і папоўз па стрэсе.
Як спраўляўся, лез кудой, дзе знайшоў ён сьцежкі,—
Але ў клеці скора быў і нашчупаў дзежкі.
Далей кублы напаткаў—адзін больш другога,
А цяжкіе—як падняць; не чэкаўшы многа
Выбраў большы, як мага, прэ перэд сабою;
Выйшоў с клеці—пакуль што, справа йдзе рукою,
Але, немач, у сенях не трапляе ў дзьверы.
У адзін бок, у другі—брудные паперы!
Ні за што знайсьці ня мог клямкі—тэй кануры,
А сабакі на дварэ аж вылазяць з скуры.
Скора неяк цыгану адчыніць ўдалося.
Толькі выйшоў, аж мужык пачуў і галосе:
„Хто там?“ і у сьлед за ім вылез злосны с хаты;
„Чаго трэба?“—А цыган (шэльма, зухаваты)
Не спужаўся, кубэл той з рук не выпускае,
Але з мейсца мужыка сам барджджэй пытае:
„Добры вечэр, гаспадар! Можэ сала трэба?“
А ўжо кубла не пазнаць, бо спямнело неба,
„У мяне свайго ёсць шмат, на ўсё лета хваце!“
Сказаў гэтак цыгану, дзьвярмі скрыгнуў ў хаце,
Зачыніўся, ды лёг спаць. Цыган с кублам вале,
А на заўтра—ой і ах!—Памінай, як звалі!...

## На начлезе

Ужо добра вечарэло—сонца ані знаку;
Над зямлёй плыў блеск, як скурка пячонаго раку.
Як авечэк, хмар тых поўна,—зоркі паўтыканы;
Бледны месяц тырчыць бокам, як абруч зламаны.
С поля быдла йдзе. рыкае; цёлка прэ са звонам...
Два сыны Крывога Янкі,—Панцялей з Супронам,—
На начлег сьпешаць с канямі: ўзялі торбы, пугі,
Повад, путы і акрыцца нейкіе дзяругі.
Лес далёка, ў ночі ціха; прыкра; глуш нямая...
Ужо хлопцы на начлезе,—огнішчэ пылае.

Вецер дзьме і дым ганяе, іскры срозь нясуцца;
Коні спутаные блізенька ля агню пасуцца.
Хлопцы селі на мураве—ім не страшна ў полі.
Скора старшы брат, Супройка, задрэмаў паволі.
Засьланіўшы шапкай вочы, нос уткнуў у бурку,
Смачна сьпіць, аж усхліпае, як кот у пячурку.
Панцялей адзін пільнуе, сьвішчэ, падпевае,
То паверне галавешкі, то гальё ўскідае.
Толькі неяк адхінуўся (быў дурны адначэ),
Глядзіць—кешта больш курчаці з белым пузам скачэ.
Не чэкаўшы вельмі доўга ухаціў адразу.
Згарнуў жар, узяў за лыдку і пячэ заразу.
Спёк, грызе ганебны косьці, выедае мяса
С такім густам, як і мёду не ядуць на Спаса!
— „Годзе спаць! Супрон прачніся! Што ад сну карысьці?
Ты ўсё сьпіш, а я ем рака, ўжо канчаю грызьці!"
— „Дзе-ж ты браў: прынес мо с хаты, ці хадзіў ў затоку?"
— „Не, ён сам агонь убачыў, прыскакаў здалёку".
— „Дурэнь-жэ ты,—Супрон, кажэ,—гэтаж, брат, рапуха!"
— „Чорт і з ёю—кончыў ногі, кончу ўжо і бруха!

## Стары кавалер

Хто жыў ў мястэчку N, той помніць
І паніча павінен знаць
Таго, што днём пагодным зрана
Выходзіў часта пагуляць.
Прыбраўшысь пекне, з гбанай палкай,
Пархумай зліты скрось да пят,
Бывало, доўга спацыруе
І абгледае паненят.
Ен чэлавек быў досць суменны,
Разумны, добры—адхваліць,
І без сумленьня с твару відна,
Калісь прыстойным мусіў быць.
А ўсё-ж ткі з гэтых ўсіх прыкметаў
Жыцьця ня меў наш чэлавек:
Не удалося ажаніцца
І кавалерам стаў на век.
Здарэньне раз мне паслужыло:
У карчме мы туга падпілі—
Аб тым аб сім вялі размову
І аб жаніцьбе пачалі.

Во, карыстаючы з здарэньня,
Яго патроху пытаць стаў,
Чаму дагэтуль не жаніўся
І час без толку змарнаваў?
Тады ён глянуў гэтак дзіка
І счырванеў у твару ўвесь:
„Ня ўмеў стрэляць, дык церэз гэта,
Больш не пытайся і ня лезь!“
Ну, пэўне гэткая адповедзь
Мяне сцікавіла, ось як.
І я донімкамі, здалёку,
Як мог, ужо стараўся ўсяк:
Пачаў пытацца асьцярожна,
І удалося для таго, —
Памалу ён мне стаў звярацца
І стаў казаць, як што было.
„Была паненка: што-ж, прыгожа,
З грашмі адна была ў бацькоў,
Я быў па вушы укахаўся,
Ня мог дабраць ён нават слоў.
Усяк бывало, дагаджаеш,
Яна не гляне і ў той бок!
І хоць ты што, нема і рады.
Нарэшце змякла праз гадок.
Руку і сэрцэ аддала мне,
І жаніхом ужо я стаў
Тагды ўжо, час абы пазволіў,
Да Вікці мілай пасьпешаў.
А бацька быў яе мысьлівы
Сусьветне лоўкі на забой:
Як толькі йдзе на паляваньне,
Дык цягне і мяне з сабой.
А я няўмеў страляць, ды з жалю
Ня мог стварэньня загубіць
Хадзіў с прымусу, хоць і прагнуў
З сваею Вікцяю пабыць:
Глядзець у вочы, цмокаць рукі,
Хацеў я надта, ды ня мог,
Бо мусіў с цесьцям скрось цягацца
Па багнах, мшарах і лесох.
Раз, неяк ў восень, пан Гіляры
(Такое імя меў мой цесьць)
На дзікоў выстроіў аблаву
(А дзікоў было мусіць с шэсьць),

Хоць не хацеў я, ўсяк стараўся
Адгаварыцца, каб ня йсьці,
Ды мусіў рушыць, хоць ты трэсьні,
І рады ўжо ня мог знайсьці.
„Ня бойся“, кажа пан Гіляры,
І хлешчэ зводьна па плячу,
„Ты перада мною станеш блізка,
Я буду мець цябе ў ваччу“.—
Пакуль ад'ехаць зрыхтавалі,
К сталу сьнеданьне падалі,
Хоць жонка як прасьцерагала,
Ды слухаць пан ня меў калі;
Перад ад'ездам міску скабак,
Каб сілы ўзмоцніць, перагрыз
І пляшку поўную гарэлкі
Сцадзіў, як відзіш, і ня лыс.
Тады і вышлі. І пан праўда
Мяне пакінуў у хмызняку,
А сам пад сосну адыйшоўся,
Крычыць, як можа, праз руку:
„Глядзі і вочы вытрэшч добра,
Чуць зварухнецца—дык стрэляй
Як у ясну сьвечку, бо то будзе
Чы дзік, чы самка, гэта знай!“
Стаю, гляджу, вылазяць вочы,
Ня бачу—проста хоць зарэж!
Тут вецер сьвішчэ, нема вые,
І горне сон мяне. Ды гдзе-ж
Я нашча быў, дык як кміноўкі
Са два келішкі сербануў,
Напало страшнае знурэньне,—
Я сеў пад кустам ды здрамнуў.
Ці доўга спаў—і сам ня знаю,
Збудзіўся, чую: меж кустоў
Шапочэ нешта, неяк стогне,
Спужаўся, з страху стыгне кроў.
Я, як жыву, ня бачыў дзіка,
Хоць чуў, што, ўсьцервіўшысь ад ран,
Бяжыць і стогне, гэтак стогне..
Як чалавек той—далі пан!
Я так і сьцяміў: мусіць дзік тут.
Устаў на ногі, цы гляджу—
Штось стогне белае, шапочэ,
Я, прытуліўшыся, сляджу...

Здалося мне, што як звычайных
    Усюды белых шмат сьвіньней,
Дык ёсьць і дзікі гэткай масьці,
    У іх мо шэрсьць крыху даўжэй.
Во, пракананы, штў мацёра
    Шасьціць і стогне між кустоў,
Зладжыўся скора, без развагі
    Смалю ня больш на сто шагоў!
Аж раптам гвалт падняў Гіляры:
    „Ратуйце, людзі“, закрычаў,
„Бадай цябе пярун урэзаў!
    „Ці ты асьлеп, каб ты хварэў?...“
Што-ж васпан скажэш? Трэба-ж ліха:
    Я стрэліў пану у пацьмах...
І сяньні я не зразумею,
    Чаго ён поўзаў па кустах?!
На шчасьце куля чуць збачыла
    І, лёгка зраніўшы, пайшла
Праз поле, лес, аж загудзела
    І нейдзе там канцы знайшла.
Дык, васпан, сам ты здагадайся.
    Што было посьля—крый нас Бог!
Прывезьлі зраненага пана,
    Ен у пасьцель надоўга злёг.
Гдзе аб каханьню было думаць?
    Хаця ешчэ-б, як той казаў,
Ну як бы ўжо там ні сталося,
    Ды хоць-бы стрэл як раз папаў
У грудзі пану, ці у сьпіну,
    У рукі, ногі, ці у бок,
Каб хоць відаць было, што стрэл той
    Даў рыцар спрытны, ці стрэлок.
А то папаў—дык проста стыдна
    І пахваліцца нема як...
У той дзёнь уцёк я і дагэтуль
    Не ажаніўшыся, бедак...“

## Паправіў

Стары Агей з двумя сынамі (сыны жанатые былі)
Чуць развідняцца пачынало на сенажаць с касамі йшлі.
Хоць стаў туман чуць уздымацца, ды цемнавата йшчэ было,
Бо ночка была непагодна, і ветрам хмар шмат нанясло.

А к сенажаці трапіць трудна і днём — ня толькі у начы,
Бо трэба йсьці цераз балота, а там канавы ды карчы.
Во, у траіх сабе памалу той то, той гэта скажэ, йдуць:
Гдзе толькі здарыцца прашкода, яе далей дзе абмінуць.
Тым часам на неспадзеваньне цянькі з дарохі іх звялі,
Загаварыліся дый цёмна -- к канаве раптам падыйшлі.
Сыны узад — шукаюць кладкі, ці перайсьці дзе па лугу;
А бацька скокнуў без развагі і ўжо на тамтым берагу.
Во старшы сын тады і кажэ: „глядзі, як татка скачэ наш,
Ен лёгак проста як сабака,—так спрыцен, бачыў ты, Тамаш?"
—«Але, я бачыў—той азваўся, ды ў гневе брата стаў карыць:
«Хай скачэ хоць не перэскачэ—чорт з ім, ды ці-ж так
(гаварыць?!«

## Рада

Калі смачнай стравай брух наладаваў,
Калі квасам хлебным горла спаласкаў,
Калі на лбе с поту ўскочаць пузыры:
Аб нудзе, аб горэ сьмела гавары!

## Хрэзьбіны Ігналі

Хлапец з дзеўкай, як два шчыглы, зране да прымрока
Выследжалі той другога, не спускалі з вока.
Ужо цыгочуць ды рагочуць, абы развіднела,
Але хай сабе як знаюць: то не нашэ дзела!
Спазніліся—міргі, сьмешкі, шэпты, ўціскі—люба!
Глядзі: жарты за вялікі: пара ўжо да шлюба.
Клім з Матронкай, як муж з жонкай абходзіцца сьмела,
Хай бацькі прасьцерагаюць: то не нашэ дзела!
Неяк скора ўсё сталося,—час ляцеў імглою.
Во Матрона нешта Клімку не дае спакою:
Усьлед ходзіць, воч ня зводзіць абы дзе сустрэлэ,
Пэўне ёсьць ужо прычына: то не нашэ дзела!
Пакуль шлюб чуць зрыхтавалі давялі ўсё к ладу,
Дык мядовы месяц здаўна апынуўся ззаду.
Ужо радзіны, ды хрысьціны чэкай заўтра сьмела.
Хоць і брыдка глядзець неяк, — то не нашэ дзела!
Чуць сваты вярнулі к дому — бач, прыйшла кабета.
На сьвет Божы сын зьявіўся не прыждаўшы лета.

Трохі гора збылі ўчора—неяк палягчэло,
Хоць с кумамі горэ будзе,—то не нашэ дзела!
Бацька з маткай у клапотах—дарма ім здалося,
Што кумамі той быць мусіць, каго хто папросе.
Хтож у праве гэткай справе атказаць насьмела?
Алеж во ні дапрасіцца—то не нашэ дзела!
Зьмітры ўпёрся: мала часу, Ганна нешта хвора
І Мікіта зноў нядужы—перапіўся ўчора,
А сягоньня нудзіць, гоніць, галава збалела.
Кожны знойдзе так прычыну,—то не нашэ дзела!
Акім толькі заўтра мог бы: жонка к зяцю прэцца,
А Кірыла зноў з Ляксандрай ў запар тры дні бьецца
Як на ліха, скрось ня ціха, а пара ляцела,
Час хрысьціць, ды адкладалі,—то не нашэ дзела!
Сын тым часам рос ня умеру; бульбай, грэчкай пхаўся,
Як цялё; ўжо досыць дужы,—трохі пасьвіць браўся.
Глядзі, горэ бацькам скора неяк палягчэло
І ён сам жджэ сваіх хрэзьбін—то не нашэ дзела!
Во нарэшце кумоў хросных удалось сазваці,
Імя сыну Ігнат далі; гоман, танцы ў хаці.
І Ігналя польку смаліць, чарку ў чарку сьмела
Пье і сам другіх частуе,—то яго ўжо дзела!

## Грамафон

Склют Нупрэй с пад Шлянц, ці Вешэк—досыць, што нязблізку
Нехатой адведаць кума раз прыпёр да Мінску.
З вёскі дзікай, як воўк з лесу, ідзе ён знарокам,
Скрозь навокал разглёдае, не міргне і вокам,
З задзівеньня рот разявіў і скрабе за вухам;
Усюды чыста, з дзьвярэй насьцеж цягне нейкім духам.
Йдзе, у вокны пазірае — ведама, цікавы —
І чаго ж ён там ня бачыў, Божэ мой ласкавы?!
Мяса, сала, хоць заешся, келбас тых без шчоту,
Проста сьлюні цякуць з губы, з'еў бы у ахвоту.
Там зноў шклянак, місак многа скуль яны бяруцца:
Усе паліцы пазайманы, аж відаць, як гнуцца.
Як гаршкоў, дайніц ці ражэк — ўсякіх капялюшаў;
Іх уздзеўшы галавы-бы з мейсца не парушыў.
А гармонікаў і дудак, — хоць лічы на копы
Барабаны больш за сіта, ёсць сусім як чопы.
Скрыпак рожнаго гатунку, — чэрці іх там знаюць!
Есць такіе, што (як чуў я) пальцэм калупаюць.

А то ёсць з вялікім пузам, як Хамы Матрона,
Ейназваньне не успомню—надта ўжо мудрона.
І зэгаркаў, як грыбоў тых ураджайным летам;
Хванаркі, як табакеркі, з аляктрычным сьветам.
Розных цацак і гарсьцёнкаў (ёсьць і ў дзесяць злоты),
А тут зноў, каб іх паляруш, з нейкім гзымсам боты.
Чэравікі ня больш—з хвігу, чорт іх хіба ўздзене,
У маіх портках—сабе мысьліць,—больш куды кішэня.
Во, спікаўлены наш Нупры ў вокна пазірае,
З аднаго к другому пхнецца, так усё займае.
Не далёка й камяніца (Нупры распытаўся),
Гдзе ягоны кум, Мікіта, дворнікам застаўся.
Запрыкмеціў тую браму—празевань баіцца,
А на вокнах ўся выстава у вачах мігціцца.
Проста воч не адарвані, хто за іх тут плаце?
Стаў, задумўся—штоб было, каб мне ўсё багацьце?
Ды застыў, разінуў ляпу, у глыбокай думе,
Уляпіўшы ў вокны вочы, прызабыў аб куме.
Як пад то у магазыне (тут і кума брама)
Грамафон завёў хтось моцна: „о, ратуй-жэ, мама!“
Нупру здалося, што кум гдзесь з жонкай плачэ, енчэ;
Далі пан, іх хтось абодвых улавіў і дрэнчэ.
У адзін бок, у другі бок глянуў Нупры, слышэ,
Ды ве сцяміць, гдзе-ткі мучаць—з жалю ледзьве дышэ.
Ен к вакну наставіў вушы; скрынка аж галосіць,
Нехта ў ёй заходзіць с плачу і ратунку просіць.
Нупры ў дзьверы, крык паробіў: „што за бэзгалоўе?
Каму, гады, вы ўзяліся адымаць здароўе?“
Не чэкаўшы, вале ў морду і пачаў ўсіх трэсьці;
Скрыня сціхла, гвалт падняўся—ні пашіць, ні зьесьці.
Даў бы Нупры яшчэ болей, бо за праўду ходзіць,—
Але, тут яго, дзесяцкі стаў за карк выводзіць!

## Гэта-ж надта міла!..

„А хвароба галаве! ты ўжо засьпевала?
Дык чэкай-жэ, я-ж цябе, каб ты запрапала!“
Гэтак с курыцай ўдваём Цімох Верэшчака
Падняў крыку на ўвесь дом, якбы йдзе ў іх драка.
Страх заеўся наш Цімоха, дастаў нож с паліцы
І, уткнуўшы у парог, пабег за курыцэй.

Ухапіўшы за бакі, выпрастаўшы плазам,
Стаў наводліў, ад рукі, куляць раз за разам.
А па вёсках такі ё звычай, хоць і сьмешны,
Але верыць пакуль што мужычок наш грэшны,
Можэ праўда, можэ й не, ды ўсе кажуць гэта,
Калі курыца пяе—дрэянная прыкмета.
Хоць якой там ні было, але жджы прыгоды:
Там прапало, там злягло, заўжды ёсьць прашкоды.
Каб трафунак стаць ня мог'рада ёсьць на гэта:
Трэба с кута у парог (то зычайна мэта)
Мерыць курыцу—тагды, што судзьба прысудзе,
Ці не стане галавы, ці хваста пазбудзе!
Во, сягодня звычай той наш Цімох прабуе
І, сагнуўшыся дугой, курыцай кіруе.
„Не дажджэш ты больш сьпеваць, чаго чэрці дзёрлі?
А натраплю ўжо спагнаць злосць нажом па горлі,
Ці зусім хвост адсяку, калі хвост прыкінеш,
Што падскочыць пад руку... а нажа ня мінеш!..“
Гэтак злуе, а парог трэйчы прыпадае;
Бачэ бедны наш Цімох—горла не мінае,
І курыца прападзе праз адну мінуту.
Ен скарэй ўжо нож кладзе, а ёй за пакуту
Кажэ: „ўсёжткі, даравацъ я табе ня маю,
Заўтра вынясу прадаць, мо купца спаткаю!“
Слова даўшы, датрымаў, збыў на рынку гора.
Жыд знаёмы, Сроль, спаткаў, купіў курку скора.
Спытаў толькі ў мужыка: несьціся ці будзе?—
Той заверыў, што рука, ручыць вельмі будзе.
Рад Цімох, што ўжо пазбыў—забіць было шкода.
Зато жыду, што купіў, была ўжо выгода:
Толькі ў хаце з рук спусьціў і пасыпаў жыта,
Курка сьпела на падзіў певенем—ды квіта.
Ажно Сроля ўзяў страх, прыкры і няміды,
А курыца па начах пяе з усей сілы,
Якой рады не ўжываў, што ей Сроль ня рабіў:
Шмэльц казіны ў горла пхаў—нічым не пасобіў.
Даўно-б к цымусу яе к шабасу прысмажыў,
Але трэфна, бо пяе, дык аддаць наважыў
І што тыдзень тры разы бегаў ўсё па рынку,
Абгледаючы вазы шпарка, без упынку.
Аж нарэшце улавіў з возам Верэшчаку,
Крычыць: „што ты нарабіў?“, лезе проста ў драку.
„Гэта-ж курыца пяе! Па знаёмству мне даў?!“
А Цімох знай плечы жме, быц аб тым ня ведаў:

„Дык чаго ты з ёй прыстаў, у чым рэч паўстала?
Бачу, курка, як прадаў, добра ручыць стала,
Бо поў слова у мяне ад ёй чуць ня было,
А ў цябе дык і пяе — гэта надта-ж міла!..“

## Няумекі і лекі

Захварэў раз Александра і аслаб быў дужа,
Немач нейкая успала — ні скула, ні ружа,
Але шмат былі апухлі правы бок з рукою;
І над днём, ня толькі ў ночы ён ня меў спакою.
Усякіх лекоў: зёлак, мазі перэпрабавалі;
Цёрлі, дзёрлі, скрэблі, рвалі, мазалі і клалі —
Ані рады. Пайшла жонка хвэльчэра паклікаць.
Той прыйшоў. Абслухаў дудкай, пачаў пальцэм тыкаць.
Акуратна бок абгледзіў, язык, горла, вуста,
Штось нагрэмзаў на паперцы дробненька і густа,—
„Прыкладайце,—кажэ,—гэтым, я зайду ў нядзелю“.
Баба плюснула у ручку сваіму збавіцелю.
Хфэльчэр выйшаў. Баба зараз (спрытна вельмі была)
Мёдам змазаўшы рэцэпту к боку прыляпіла.
У нядзелю хфэльчэр спраўдзіць зноў зайшоў да дому,
Сеў на зэдлі і пытае: „Якое-ж старому?
Як лекарства, ці хоць трохі ёсьць якой паправы?“
— «Не, панок,—спыняе жонка,—не зусім цікава:
Картка гэта йшчэ на боку, прыкарэла дужа».
Хфэльчэр, з дзіву, аж затросся, ды барждкэй да мужа,
Павярнуў—аж ткі і праўда: рэцэпт быў на целе;
Як наробіць тады крыку: «Ці вы зварьяцелі?!»
Зноў спісаў другую картку, бабу без адкладу
Шле ў аптэку, ёй тлумачыць, каб зрабіць да ладу.
Глядзі—баба праз гадзіну ўжо дамоў прыпёрла
І з аптэчнай пляшкі корак выдзірала з горла:
Пальцэм ткае, цьвекам порэ, ня дасьць рады матка.
Сын узяўся, а ён бачыў, як спраўляўся татка.
Сьціснуў з нізу, аб далоні калі пяткай жарне—
„Во як трэба!“—кажэ матцы,—„чымсь час траціць марне“.
Усё гатова. Мазьзю жоўтай баба вехцем добра
Шмаравала, як належыць, бок, руку і жобра.
Наліла міхстуры ў шклянку, як гарбаты, поўна,
Падала, тлумачыць мужу, нібы хфэльчэр—роўна:
„Мой Ляксандра, не спрэчайся, зрабі па расказу—
Ён казаў па лыжцы сёрбаць, не хватаць адразу!“

Але к вечару у той дзень ужо лекарства счэзло:
Стары сёрбаў, спадабаўшы, пакуль толькі лезло.
Жонка зноў гадзіла мужу, шмаравала тлуста;
Глядзі—ў вечар у тэй пляшцы стала саўсім пуста!
Во, назаўтра баба зрана зноў лекарства просе:
Кажэ „як панюхаць далі, і не засталося!
Трэба болей, калі ласка, каб на дзён хоць колькі!“
Хвэльчэр злаяў—„дзед чы жывы, чы хватаюць колькі?“
Як стары, пі ёсьць гарачка і чы добра сьпіцца?
Зноў тлумачыць пачаў бабе, ды стаў з ёй сварыцца:
„Каб вас ліха, ўсе вы дурні, як адзін, у хаце,
На! І больш не спадзевайся—тут на месяц хваце!“
Плачэ баба і лекарства беражэ, скупіцца,
Лье ашчэдна—ўсё пад меру, перэдаць баіцца.

. . . . . . . . . . . . .

...А праз дзьве нядзелі—стары ўстаў с пасьцелі...

LATVIJAS VALSTS BIBLIOTEKA

19.6.4
Бел. аддзел
1994 г.

B000000311941 5